# *Дзейнасць дзіцячых і школьных бібліятэк Беларусі па актывізацыі інтэлектуальна-пазнавальнай дзейнасці дзяцей і падлеткаў*

Тыя змены, якія адбываюцца ў свеце, а таксама сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ў нашай краіне накладваюць свой адбітак на духоўнае жыццё, менавіта на адукацыю і культуру. У сувязі з неабходнасцю падрыхтоўкі для нашай сувярэннай дзяржавы адукаваных, высокаінтэлектуальных, нацыянальна свядомых, падрыхтаваных да самастойнага жыцця і працы маладых грамадзян была праведзена рэформа агульнаадукацыйнай школы, у выніку якой з'явіліся навучальныя ўстановы новага тыпу: гімназіі, ліцэі, каледжы, колькасць якіх у нашай краіне пастаянна павялічваецца. У гэтых навучальных установах больш увагі надаецца стварэнню адпаведных умоў для развіцця ў навучэнцаў інтэлектуальнага і творчага патэнцыялу, засваення агульначалавечых каштоўнасцяў, культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, выкарыстання сучасных тэхналогій. У спецыяльным педагагічным друку неаднаразова падкрэслівалася, што навучэнцы гэтых устаноў імкнуцца да самаадукацыі, у іх развіта адказнасць за сваю вучобу, яны цікавяцца літаратурай па-за межамі вучэбнай праграмы. Таму ў такіх навучальных установах улічваюцца індывідуальныя асаблівасці кожнага навучэнца і вядзецца пэўная работа па падрыхтоўцы найбольш здольных да працягу адукацыі ў вышэйшых навучальных установах.

У сувязі з гэтым органы кіравання звяртаюць вялікую ўвагу на падбор педагагічных кадраў для гэтых навучальных устаноў, а таксама бібліятэчных супрацоўнікаў. У прыватнасці, для супрацоўнікаў бібліятэк абавязковым з'яўляецца наяўнасць спецыяльнай адукацыі, валоданне сучаснымі тэхналогіямі пры фарміраванні і выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў.

Настаўнікі школ, іх бацькі робяць усё, каб лепш падрыхтаваць дзяцей да жыцця ў новых умовах. Як сведчаць публікацыі перыядычнага друку, на сучасным этапе ў агульнаадукацыйных установах пэўная ўвага надаецца сістэме «настаўнік-навучэнец» і «навучэнец-настаўнік». Нам падаецца, што да гэтага трэба дадаць яшчэ «настаўнік-навучэнец-бібліятэкар» і «навучэнец-настаўнік-бібліятэкар», таму што супрацоўнікі бібліятэк робяць усё магчымае, каб дапамагчы навучальным установам рознага тыпу справіцца з пастаўленымі задачамі, праводзяць значную работу ў дапамогу вучэбнаму і выхаваўчаму працэсу, садзейнічаюць развіццю інтэлектуальна-пазнавальнай дзейнасці дзяцей і падлеткаў.

Разам з настаўнікамі вялікі ўдзел у фармраванні асобы школьніка, падрыхтоўкі яго да жыцця ў новых ўмовах прымаюць дзіцячыя і школьныя бібліятэкі. У Законе «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь» падкрэсліваецца, што асноўнымі прынцыпамі дзейнасці бібліятэк з'яўляюцца:

- вызначэнне агульначалавечых каштоўнасцей у якасці прыярытэтных;
- садзейнічанне адраджэнню і развіццю культурных традыцый і захаванню каштоўнасцяў беларускай нацыі, іншых нацыянальнасцей, якія пражываюць у краіне, захаванасці гісторыка-культурнай спадчыны;
- распаўсюджванне гуманістычных ідэй, навуковых ведаў і дасягненняў сусветнай культуры [1, с.4].

У нашай краіне пэўная ўвага надаецца бібліятэчнаму абслугоўванню дзяцей і падлеткаў, таму што кніга, прачытаная ў дзяцінстве, застаецца ў памяці на ўсё жыццё. Трэба пагадзіцца, мабыць, і з такім тэзісам, што галоўны інфармацыйны багаж чытача набываецца менавіта ў школьным узросце. У гэты час складаецца і ўменне карыстання бібліятэчнымі рэсурсамі. Дзіцячыя бібліятэкі арганізуюць бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і падлеткаў, кіраўнікоў дзіцячым чытаннем. Яны садзейнічаюць гарманічнаму развіццю асобы школьнікаў, арганізацыі вучэбнага і выхаваўчага працэсу, прывіваюць навыкі самастойнай работы з кнігай.

З кожным годам павялічваюцца патрабаванні і да арганізацыі работы дзіцячых і школьных бібліятэк у новых умовах. Бібліятэкі, якія абслугоўваюць дзяцей, маюць магчымасць дапамагчы дзецям ажыццявіць з дапамогай кнігі больш мяккі пераход ад вучобы ў школе да жыцця. Лепш за ўсё змалку далучаць дзяцей да самастойнага чытання, да выкарыстання кніг для атрымання ведаў, вучыць набываць веды ў бібліятэцы. Адна з галоўных задач, якая стаіць перад бібліятэчнымі супрацоўнікамі, – весці пастаянную работу па распаўсюджванні інфармацыйнай культуры сярод дзяцей і падлеткаў. Калі дзеці будуць валодаць ёю, яны змогуць самастойна пашыраць свой кругагляд, задавальняць свае запыты з дапамогай кніг.

Дзецям уласціва жаданне пазнаць свет, у тым ліку праз кнігу, таму асаблівае значэнне маюць рэкамендацыі настаўнікаў, бацькоў, бібліятэкараў. Бібліятэчныя супрацоўнікі садзейнічаюць праяўленню зацікаўленасці дзяцей да ведаў, мастацтва, фарміраванню самасвядомасці, з дапамогай кнігі далучаюць дзяцей да вырашэння паўсядзённых праблем у жыцці.

Адным з найбольш яскравых прыкладаў садзейнічання развіццю інтэлектуальна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў ва ўмовах дзіцячых і школьных бібліятэк з'яўляецца выданне і выкарыстанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часопіса «Бібліятэка прапануе», заснавальнікам якога з'яўляецца ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска». Асноўныя рубрыкі часопіса накіраваны на ажыццяўленне асветніцкай і выхаваўчай дзейнасці бібліятэк. Сярод іх: «Аб чым не паведаў падручнік», «Да 65-годдзя вызвалення Беларусі», «Давай ганарыцца, што мы беларусы», «Да нас новая кніга прыйшла», «Бесперапынная прафесійная адукацыя», «Да Году роднай зямлі», «Да Міжнароднага году моў» і інш. Кожная назва рубрык сведчыць аб іх актуальнасці, папыце як сярод бібліятэчных супрацоўнікаў, так і чытачоў-навучэнцаў.

У першую чаргу хочацца звярнуцца да рубрыкі «Аб чым не паведаў падручнік». Гэта, на наш погляд, адна з самых унікальных рубрык. Упершыню ў Беларусі бібліятэка распаўсюджвае такі патрэбны матэрыял праз перыядычнае выданне. Аб запатрабаванасці гэтай рубрыкі сведчаць назвы матэрыялаў, змешчаных у ёй. Вялікую цікавасць выклікаюць публікацыі Кенька Т., Кенька М. У прыватнасці, «Што мы ведаем пра помнікі літаратурным героям: камень, бронза і героі кніг», «Памятники русалкам: камень, бронза и герои книг». «Тренинг по профориентации» (Бародзіч В., Хоміч В.), «Всё самое интересное: сценарий развлекательно-познавательного шоу» (Гурынава М.), «Винни-Пух и семь чудес мёда: познавательное мероприятие по здоровому образу жизни и экологическому воспитанию» (Касцючкова І.) і інш.

Вялікае значэнне ў патрыятычным выхаванні мае рубрыка «Да 65-годдзя вызвалення Беларусі». Тут збіраюцца новыя, раней невядомыя матэрыялы, прысвечаныя суайчыннікам. У тым ліку: «Слушая последних свидетелей: час размышлений» (Несцяровіч Л.), грунтоўная кніжная выстава «Славім вялікі подзвіг», «Примерный план проведения часа памяти, посвящённого 65-летию трагедии Минского гетто» (Ціманюк С.) і інш.

Фарміраванню самасвядомасці і далучэнню да нацыянальнай культуры садзейнічае рубрыка «Давай ганарыцца, што мы беларусы», у якой размяшчаюцца такія матэрыялы, як «Образ Ефросиньи Полоцкой в литературе и искусстве» (Арская Е.) і «Душою гавару...»: літаратурна-паэтычная вечарына, прысвечаная жыццю і творчасці Раісы Баравіковай» (Юдчыц Л.) і «Да году роднай зямлі», у якой змешчаны такія матэрыялы, як «Беларускія балоты – багацце нашай краіны: пазнавальна-экалагічная гадзіна (Кавальчук Т.), «Імгненні, пакладзеныя на словы: літаратурна-паэтычны трыпціх па творах А. Разанава, М. Арахоўскага, В. Супрунчука» (Драган А.) і інш.

Асаблівае значэнне для бібліятэчных супрацоўнікаў мае пастаянная рубрыка «Раім адзначыць». Вядома, чытачы не могуць быць раўнадушнымі да такіх матэрыялаў, як «Да дня беларускага пісьменства» (Смірнова В.), «Мастак, што ажыўляў камень: агляд-экскурсія па выставе кнігі Заіра Азгура «Тое, што памятаю...» (Макаранка Л., Ільмоўская І.)

У рубрыцы «Да нас новая кніга прыйшла» размяшчаюцца азнаямляльныя матэрыялы аб новых кнігах, аглядныя матэрыялы аб творчасці таго ці іншага пісьменніка. Нам падаецца, што не магло быць абыякавых да публікацыі «Таямнічая планета Уладзіміра Мазго» (Сінельнікава І.).

У апошнія гады на бібліятэчных форумах рознага кшталту, айчынных і міжнародных, усё больш увагі надаецца сацыялізацыі, выкарыстанню сучасных тэхналогій у бібліятэках, задавальненню інфармацыйных запытаў карыстальнікаў. Усё часцей падкрэсліваецца, што дзеці сталі менш чытаць, іх займае камп'ютар, а на чытанне не застаецца часу. Але чаму мы, бібліятэчныя супрацоўнікі, сталі менш гаварыць аб выхаванні, аб уздзеянні кнігі на дзяцей і падлеткаў?

На наш погляд, заслугоўвае ўвагі думка Н.І. Гендзінай, што неабходна «преодолеть разрыв между культурой традиционной – книжной, каталожной, во многом архаичной – и новой, электронной культурой, потому что появление одной не отрицает другую. Очень часто современный подросток, ребёнок этого не понимает, уповая на то, что всё решается только с помощью компьютера и Интернета. Мир книги не умер, библиотеки как были, так и остаются основным социальным институтом – держателем информации. Надо научить человека пользоваться и тем, и этим» [2, с.15]. Таму яна лічыць, што толькі бібліятэкар можа зблізіць кнігу з камп'ютарам. І зробіць гэта так, што камп'ютар будзе дапамагаць фарміраванню творчай асобы.

Факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКіМ рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў шырокага профілю ў розных галінах бібліятэчнай справы, якія абслугоўваюць дзяцей і падлеткаў. Выпускнікі універсітэта прыйдуць на дапамогу настаўніку, каб разам з ім весці вялікую працу ў дапамогу інтэлектуальна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў, садзейнічаць гуманітарна-культурнаму выхаванню падрастаючага пакалення, фарміраванню творчай асобы школьніка.

***Н.А. Ляйко,***
***канд. гіст. навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў БДУКіМ***

***Спіс літаратуры***

1. *Аб унясенні* змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь»: Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 ліст. 2002 г. №147-З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 2002.– № 128. – С. 21-29.
2. *Бібліятэка* прапануе: вытворча-практычны часопіс / заснавалькік ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска». – 2009. –№ 1-11; 2008. – № 1-12.
3. *Гендина, Н.И.* Презентация книги Н.И. Гендиной, Н.И. Колковой, Г.А. Стародубовой, Ю.В. Уленко «Школьная библиотека как центр формирования информационной культуры личности / Н.И. Гендина // Школьная библиотека. – 2009. –№ 3.– С.12-15.
4. *Элиасберг, Н.И.* Проблемы воспитания нравственных свойств личности и гражданственности в условиях информатизации образования / Н.И. Элиасберг // Школьная библиотека.– 2005.– № 9-10.– С. 73-81.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ